Сяргей ЕЛІЗАРАЎ

# ТАРЫФ "АДКАЗНЫ": рэгуляванне заработнай платы кіруючых кадраў савецкага дзяржаўнага апарату ў БССР (1919—1930 гг.)

*З прыходам бальшавікоў да ўлады ім давялося вырашаць мноства канкрэтных практычных пытанняў, якія раней прадстаўляліся малазначнымі і простымі. Сярод іншага трэба было распрацаваць адпаведную сістэму аплаты працы, вызначыць прынцыпы яе пабудовы, механізм функцыянавання, ды і ў цэлым ролю матэрыяльнага стымулу ў кадравай палітыцы савецкай улады. Патрабавала рашэння і пытанне аб месцы матэрыяльнай зацікаўленасці ў працы кіруючых савецкіх работнікаў, суадносінах узроўню і якасці іх заработнай платы з узроўнем і якасцю заработнай платы радавых працоўных.*

У савецкай гістарыяграфіі тэма генезісу аплаты працы партыйных і савецкіх кіраўнікоў усіх узроўняў была закрытай: можна было пісаць аб змене заработнай платы рабочых, служачых, калгаснікаў, але не работнікаў партыйна-савецкай вертыкалі ўлады. З канца 1980-х гг. забарона на гэтую тэму была знятая, і ў постсавецкай гістарыяграфіі з'явіліся працы, прысвечаныя дадзенаму пытанню. Яны пераважна падрыхтаваныя расійскімі і англамоўнымі даследчыкамі і тычацца галоўным чынам саюзнага звяна партыйна-дзяржаўнага апарату, практычна пакідаючы (за рэдкім выключэннем) па-за межамі ўвагі адпаведныя кадры саюзных рэспублік[1]. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі гэтую праблему закранула толькі Т.Процька[2]. Спецыяльныя даследаванні, прысвечаныя аплаце працы апарату ўлады і кіравання ў БССР, на сённяшні дзень адсутнічаюць. Паспрабуем паказаць генезіс сістэмы аплаты працы кіруючых кадраў савецкіх органаў дзяржаўнай улады і кіравання (мясцовыя саветы, Цэнтральны выканаўчы камітэт (ЦВК) і Савет народных камісараў (СНК) БССР) — "адказных палітычных работнікаў" — у першае дзесяцігоддзе існавання БССР, механізм функцыянавання гэтай сістэмы, узровень аплаты працы, а таксама выявіць суадносіны паміж такімі з'явамі савецкай рэчаіснасці, як наменклатура і тарыф "адказны".

У першыя гады савецкай улады сістэма аплаты працы кіруючых кадраў органаў улады і кіравання рознага рангу грунтавалася на яшчэ ранейшых, ураўняльных уяўленнях аб адпаведнасці яе памераў ўзроўню заработнай платы сярэдняга кваліфікаванага рабочага, што замацавалі ў "даўладны", "дасавецкі" перыяд: "плата не вышэй платы рабочага"[3]. Гэтая задача не выглядала складанай: ужо ў Расійскай Імперыі ў беларускіх губернях, па падліках беларускай даследчыцы Г.У.Аляксашынай, многія дзяржаўныя служачыя (у павятовых гарадах — пераважная большасць, у губернскіх — траціна) атрымлівалі



***ЕЛІЗАРАЎ Сяргей Аляксандравіч.***

*Прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплін Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя П.В.Сухога, доктар гістарычных навук, прафесар. Нарадзіўся ў 1955 г. у Архангельску (Расія). У 1978 г. закончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 1983 г. — аспірантуру БДУ. У 2013 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)". Аўтар больш за 200 навуковых і метадычных публікацый, у тым ліку манаграфій "Формирование и функционирование системы административно-территориального деления БССР (1919—1991 гг.)" (Гомель, 2009), "Становление и развитие системы местных Советов БССР в 1919—1929 годах" (Гомель, 2016).*

жалаванне ў мінімальным для сваёй катэгорыі памеры, што знаходзілася прыкладна на ўзроўні заробку фабрычнага рабочага са спецыяльнасцю. Значна ўзрастаў іх матэрыяльны дастатак толькі ў выніку атрымання "сталовых" (якія даходзілі да 100% заробку) і "кватэрных" (ад 50 да 80% заробку)[4].

Першапачаткова зарплата савецкіх кіруючых работнікаў рэгулявалася агульнымі для ўсіх савецкіх служачых (саўслужачых) прававымі актамі, асноўнымі з якіх з'яўляліся пастанова СНК РСФСР ад 26 красавіка 1918 г. "Аб парадку выплаты жалавання служачым урадавых устаноў" і яго ж дэкрэты ад 27 чэрвеня 1918 г. і 12 кастрычніка 1918 г. "Аб аплаце працы служачых і працоўных савецкіх устаноў".

Пастановай 1918 г. адмянялася выплата "сталовых" і "кватэрных", а ўсе віды грашовага забеспячэння аб'ядноўваліся ў адзін. Таксама адмянялася права кіраўнікоў дзяржустаноў выдаваць узнагародныя і грашовыя дапамогі для служачых за кошт эканоміі сродкаў[5].

Дэкрэт ад 27 чэрвеня 1918 г. вылучыў у асобную групу служачых *"адказных кіраўнікоў"* ("першая група"), да якіх адносіліся наркамы, члены калегій наркаматаў, члены Прэзідыума Усерасійскага цэнтральнага выканаўчага камітэта (УЦВК) і выканкамаў, загадчыкі ўстаноў (самастойных аддзелаў, аддзяленняў і секцый), кіраўнікі спраў. У сваю чаргу гэтая група па тарыфных стаўках падзялялася на катэгорыі. Выявілася, што да адказных кіраўнікоў адносіліся таксама *"адказныя работнікі са спецыяльнымі ведамі"* (лекары, інжынеры, юрысконсульты, суддзі, следчыя, навукоўцы, аграномы і г. д.), бухгалтары цэнтральных устаноў, справаводы 1-га разраду, рэвізоры і некаторыя іншыя катэгорыі. Вышэйшая тарыфная стаўка для іх вызначалася ў памеры 800 рублёў, ніжэйшая — 700 рублёў[6].

Неўзабаве склад адказных кіраўнікоў быў скарэктаваны. Дэкрэт ад 12 кастрычніка 1918 года вылучаў асобна *"адказныя"* і *"менш адказныя"* пасады. Да першых адносіліся загадчыкі аддзелаў, аддзяленняў, пададдзелаў і іх памочнікі, кіраўнікі справамі, сакратары аддзелаў, інструктары, а таксама *"адказныя асобы са спецыяльнымі ведамі"*. А вось катэгорыя "менш адказныя" выразна не вызначалася, хоць па тэксце дакумента можна зразумець, што да яе адносілі ўсе *"іншыя пасады кіруючага характару"* — вельмі агульнае і расцягнутае вызначэнне, якое дазваляла пры жаданні аднесці да яе практычна любога работніка. Таксама дэкрэтам былі павялічаны цвёрдыя тарыфныя стаўкі для адказных работнікаў Масквы (загадчыкі ўстаноў, якія кіруюць іх справамі, загадчыкі самастойных аддзелаў, аддзяленняў і секцый устаноў, адказныя асобы са спецыяльнымі ведамі) — ад 885 да 1000 рублёў у месяц[7].

На падставе апошняга дэкрэта з 1 верасня 1918 г. адказныя работнікі Заходняй камуны (да іх былі аднесеныя загадчыкі ўстаноў, аддзелаў, члены калегій аддзелаў устаноў, члены прэзідыума аблвыканкама і губвыканкамаў) атрымлівалі ад 750 да 900 рублёў у месяц, служачыя са спецыяльнымі ведамі і вопытам, якія працавалі пад кіраўніцтвам *"адказнай асобы"* — ад 585 да 750 рублёў, прафесійныя служачыя і рабочыя без спецыяльных ведаў, але з неабходным вопытам і навыкамі — ад 450 да 600 рублёў, *"менш вопытныя работнікі, канторшчыкі, служачыя без стажу"* — ад 405 да 450 рублёў, малодшыя савецкія служачыя — ад 387 да 650 рублёў.[8] Гэтыя стаўкі дзейнічалі і пасля ўтварэння ССРБ.

Які ўзровень жыцця мог забяспечыць гэты заробак? Па падліках губернскага бюро Мінскага аддзела Усерасійскага прафсаюза работнікаў фінансава-падатковай справы, пражытачны мінімум на аднаго чалавека ў студзені 1919 г.у Мінску складаў у месяц (на прадукты харчавання, мыла і газу) — 581 рубель 60 капеек, а разам з аплатай кватэры, рамонтам абутку і адзення і выплатамі з жалавання — 730 рублёў[9]. Такім чынам, пад гэты мінімальны ўзровень падыходзілі заробкі толькі некаторых катэгорый адказных работнікаў і служачых са спецыяльнымі ведамі, а таксама кіраўнікоў ССРБ, якія сваім рашэннем ад 11 студзеня 1919 г. вызначылі сабе значна больш высокія стаўкі (членам урада і кіраўніку справамі — 1500 рублёў у месяц, сакратарам урада — 1200 рублёў у месяц)[10]. Заробак астатніх катэгорый дзяржслужачых быў ніжэй (для многіх — значна) мінімальнага пражытачнага ўзроўню.

Са студзеня 1919 г. у Савецкай Расіі ўводзілася адзіная 35-разрадная тарыфная сістэма аплаты працы пры суадносінах крайніх разрадаў (першага да трыццаць пятага) як 1 да 5. У ССРБ для работнікаў савецкіх, грамадскіх і гандлёвых устаноў яна была зацверджана 25 лютага 1919 г. на пасяджэнні ЦВК ССРБ. Мінімальная тарыфная стаўка першага разраду (кур'еры, прыбіральшчыцы) усталёўвалася ў памеры 600 рублёў у месяц, максімальная (35-га разраду) — у 2700 рублёў. Кіруючыя савецкія работнікі ўключаліся ў разрады з 16-га (загадчыкі невялікіх аддзелаў і ўстаноў — атрымлівалі 1224 рублёў) па 27-мы (кіраўнікі цэнтральных устаноў — 2052 рублі). Заўважна, што кіруючы склад вызначаўся зноў у самым агульным выглядзе без канкрэтнай расшыфроўкі *("загадчыкі аддзеламі прадпрыемстваў і ўстаноў", "кіраўніцтва справамі ў цэнтральных установах", "загадчыкі аддзелаў цэнтральных устаноў")*, што дазваляла кіраўнікам розных органаў і арганізацый самастойна вызначаць іх канкрэтны службовы склад. Для Мінска гэтыя тарыфныя стаўкі выплачваліся ў поўным памеры, у паветовых гарадах — у памеры 90%, у вёсках, мястэчках, заштатных гарадах — не больш за 75% па ўзгадненні з наркаматам працы[11].

Аднак такая сістэма зусім не замяняла (не адмяняла) спецыяльныя тарыфы. У прыватнасці, у 1919 г.

з'яўляюцца асобныя тарыфы адказных палітычных работнікаў. У сакавіку 1919 г. Прэзідыум УЦВК пастанавіў *"стварыць камісію для выпрацоўкі ставак членам УЦВК і членам калегіі народных камісарыятаў"*, якая распрацавала адзіную сістэму аплаты працы ўсіх кіруючых кадраў. Яе Прэзідыум УЦВК і зацвердзіў пастановай "Аб аплаце працы адказных палітычных работнікаў" ад 16 красавіка 1919 г.[12].

Усе адказныя палітработнікі дзяліліся па аплаце на чатыры групы. Суадносіны заробку чацвёртай (ніжэйшай) групы да першай (вышэйшай) складалі 1 да 1,2 (1700 рублёў — 2000 рублёў), што адлюстроўвала ўраўняльныя перавагі тагачаснага партыйнага і савецкага кіраўніцтва. У першую групу ўваходзіла вышэйшае савецкае кіраўніцтва: члены СНК, Прэзідыума УЦВК, УЦВК, калегій наркаматаў, глаўкаў, члены гарвыканкамаў буйных гарадоў. Другую складалі члены выканкамаў губернскіх гарадоў з насельніцтвам звыш 75 тыс. чалавек, трэцюю — з насельніцтвам звыш 50 тыс. чалавек, чацвёртую — менш за 50 тыс. чалавек.

Даволі хутка (у кастрычніку 1919 г.) у гэты тарыф унеслі змены[13]. Цяпер ён уключаў адказных палітычных работнікаў усіх без выключэння савецкіх устаноў, як грамадзянскіх, так і ваенных. Значна вырас і канкрэтызаваўся іх пералік: члены УЦВК і яго Прэзідыума, СНК, калегій наркаматаў, калегій усерасійскіх устаноў, члены выканкамаў Петраграда і Масквы, камісары і члены абласных, акруговых, губернскіх і павятовых выканкамаў і некаторыя іншыя. Усе яны дзяліліся ўжо на 5 разрадаў. Відавочна, што спіс быў пашыраны за кошт кіраўнікоў абласнога, акруговага, губернскага і павятовага звёнаў улады і кіравання. У сувязі са значным пашырэннем складу адказных палітработнікаў змяніліся і суадносіны паміж першым (ніжэйшым) і пятым (вышэйшым) разрадамі — 1 да 1,35 (3100 рублёў — 4200 рублёў).

8 чэрвеня 1920 г. быў прыняты новы Дэкрэт УЦВК "Аб тарыфе адказных палітычных работнікаў", які яшчэ больш дыферэнцыраваў сістэму аплаты гэтай катэгорыі дзяржаўных служачых. Паводле яго тарыфныя стаўкі дзяліліся на тры групы: першая — работнікі раёнаў з развітой прамысловасцю, другая — напаўпрамысловых раёнаў, трэцяя — непрамысловых раёнаў. *Размеркаванне па групах ажыццяўлялася на* месцах губернскімі прафсаюзамі сумесна з губвыканкамамі і зацвярджалася Усерасійскім цэнтральным саветам прафесійных саюзаў (УЦСПС). Адначасова ўсе адказныя палітычныя работнікі размяркоўваліся на пяці ўдакладненых разрадах. Да пятага адносіліся члены прэзідыума і члены УЦВК, СНК, члены калегій народных камісарыятаў, члены выканкамаў Петраграда і Масквы. Члены губвыканкамаў адносіліся да 4-2-га разрадаў (у залежнасці ад колькасці жыхароў губернскіх цэнтраў). Члены павятовых, валасных і сельскіх выканкамаў залічваліся ў першы разрад, пры гэтым члены валасных выканкамаў атрымлівалі заробак на 20% менш за членаў павятовых выканкамаў, а сельскіх выканкамаў — на 20% менш за членаў валасных выканкамаў. Акрамя тарыфнай стаўкі ніякіх выплат у выглядзе прэміі, аплаты за звышурочную працу і г. д. не дапускалася. Пры гэтым час працы адказных палітработнікаў не абмяжоўваўся[14]. Было прынята рашэнне *"у мэтах урэгулявання пытання аб утрыманні адказных палітычных працаўнікоў, якія вядуць выключна партыйную працу"*, распаўсюдзіць зацверджаны дэкрэтам тарыф і на іх[15].

Больш высокі ўзровень матэрыяльнага забеспячэння адказных работнікаў выклікаў крытыку не толькі радавых камуністаў, але і некаторых кіруючых партыйных работнікаў, якія заставаліся прыхільнікамі прынцыпу роўнай аплаты працы рабочых і кіраўнікоў (групы "дэмакратычнага цэнтралізму" і "рабочай апазіцыі"). Пад іх ціскам на IX Усерасійскай канферэнцыі РКП(б) (верасень 1920 г.) у рэзалюцыі "Аб чарговых задачах партыйнага будаўніцтва" было прапанавана *"выпрацаваць цалкам прыдатныя практычныя меры да ліквідацыі няроўнасці (ва ўмовах жыцця, у памеры заробку і г. д.) паміж спецамі і адказнымі работнікамі, з аднаго боку, і працоўнай масай, з другога"*[16].

23 чэрвеня 1921 г. на падставе Дэкрэта ад 8 чэрвеня 1920 г. і рашэння IX Усерасійскай канферэнцыі РКП(б) пастановай УЦСПС з 1 мая 1921 г. уводзілася ў дзеянне новае палажэнне аб тарыфе адказных работнікаў прафсаюзных, эканамічных, савецкіх і партыйных арганізацый. Для гэтай катэгорыі служачых аплата працы ўсталёўвалася ў залежнасці ад памеру сярэдняга заробку рабочых і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў (браўся за 100%), дзе яны працавалі. У прыватнасці, у розных установах (у тым ліку і ў органах улады і кіравання) за аснову браўся сярэднямесячны заробак работнікаў установы, аднесеных да 20-га разраду 35-разраднай тарыфнай сеткі (вылічваўся шляхам складання месячнага заробку ўсіх супрацоўнікаў установы 20-га разраду і дзялення атрыманай сумы на іх агульную колькасць). Самі тарыфныя стаўкі адказных работнікаў дыферэнцыраваліся ўжо па шасці разрадах: аднесеныя да першага (ніжэйшага) разраду атрымлівалі 100% сярэднямесячнага заробку служачых 20-га разраду, да шостага (вышэйшага) — 150%[17].

У мэтах абмежавання розначытанняў у вызначэнні работнікаў гэтай катэгорыі у выдадзенай інструкцыі УЦСПС тлумачылася, што адказныя палітычныя работнікі — гэта *"прафесійныя, партыйныя, кааператыўныя, савецкія і гаспадарчыя работнікі, якія прымаюць адказны ўдзел у справе прафесійнага, партыйнага, кааператыўнага, савецкага і гаспадарчага будаўніцтва, якія нясуць адказнасць не толькі за тэхнічнае выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў, але якія з'яўляюцца адказнымі за ідэйны і палітычны кірунак і правядзенне ўскладзеных на іх функцый"*[18].

У 1921 г. Саўпрафбелам на аснове дэкрэта было прынята сваё палажэнне аб аплаце працы адказных работнікаў, якое ўступала ў сілу з 1 верасня 1921 г. Беларускае палажэнне да згаданай катэгорыі адносіла *членаў валасных і павятовых выканкамаў*, прэзідыумаў павятовых і гарадскіх выканкамаў, загадчыкаў аддзеламі і адказных палітычных інструктараў павятовых выканкамаў, губернскіх і павятовых інспектараў працы, членаў Прэзідыумаў ЦВК і СНК БССР, наркамаў і іх намеснікаў, упаўнаважаных РСФСР пры СНК ССРБ. Стаўкі таксама дыферэнцыраваліся па шасці разрадах: ад 175 тыс. рублёў па першым разрадзе да 262,6 тыс. рублёў па шостым. Тарыф налічваўся з разліку 175% сярэдняй тарыфнай стаўкі для Мінска з адпаведным паніжэннем для паветаў і валасцей. Як і ў агульным палажэнні, не дапускалася ніякіх дадатковых выплат у выглядзе прэмій і звышурочных акрамя тарыфнай стаўкі, а час працы адказных работнікаў не абмяжоўваўся, платнае сумяшчальніцтва для іх не дазвалялася. Дадатковае ўзнагароджанне дапускалася толькі за выкананне *"літаратурнай і выкладчыцкай работы, якая не ўваходзіць у кола абавязкаў работнікаў"*[19].

Наяўная методыка разлікаў (аднясенне да розных тарыфных паясоў, павышальныя і паніжальныя каэфіцыенты), асобныя тарыфы адказных работнікаў дазвалялі на справе абыходзіць афіцыйна зафіксаваныя суадносіны крайніх разрадаў па 35-разраднай сетцы як 1 да 5. Так, у кастрычніку 1921 г. тарыфная стаўка старшыні ЦВК і СНК ССРБ А.Р.Чарвякова, сакратара ЦВК ССРБ І.Г.Клішэўскага і члена ЦВК ССРБ В.Г.Кнорына складала 262,6 тыс. рублёў, сакратара СНК БССР А.А.Сташэўскага — 245 тыс. рублёў. На іншым полюсе знаходзіліся справаводы (па 54,6 тыс. рублёў), машыністкі (па 46,2 тыс. рублёў), кур'еры (па 30 660 рублёў), прыбіральшчыкі (па 27 130 рублёў)[20]. Такім чынам, разбежка тарыфных ставак савецкіх служачых па 35-разраднай сетцы ў рэальнасці даходзіла да 1 да 10.

З канца 1921 г. адбываецца пераход з 35-разраднай на 17-разрадную тарыфную сетку, якая афіцыйна адмяняла асобны тараф "адказны". Ураўняльныя тэндэнцыі хутка страчвалі свае пазіцыі: суадносіны паміж крайнімі разрадамі складалі ўжо 1 да 8. Гэтая сістэма была замацаваная ў новым Кодэксе аб працы, *прынятым на IV сесіі УЦВК 9 лістапада* 1922 г. Адпаведна і Саўпрафбел сваёй пастановай з 1 лістапада 1921 г. адмяняў асобны тарыф адказных работнікаў. Цяпер адказныя адміністрацыйна-кіруючыя работнікі савецкіх дзяржорганаў улады і кіравання атрымлівалі аплату па тарыфах 12—17-га разрадаў: члены вышэйшага савецкага рэспубліканскага кіраўніцтва (члены Прэзідыума ЦВК, СНК ССРБ, члены калегій наркаматаў), члены прэзідыумаў павятовых і гарадскіх выканкамаў, члены павятовых і валасных выканкамаў, загадчыкі аддзелаў павятовых выканкамаў, павятовыя інспектары працы[21]. Па сутнасці, тарыф "адказны" захаваўся, але ўжо як складовая частка агульнай тарыфнай сеткі заработнай платы.

З лютага 1922 г. у ССРБ у чарговы раз удакладнілі спіс адказных палітработнікаў: пералік пасад дапоўнілі членамі сельсаветаў, а таксама ўпаўнаважанымі наркаматаў у паветах, дзе адсутнічалі адпаведныя самастойныя аддзелы. З 1 лютага 1922 г. у ССРБ тарыфная стаўка адказных палітработнікаў за кошт іх пераводу ў больш высокую групу (з трэцяй у першую) павялічвалася на 15%. Акрамя таго, з'явілася яшчэ адна афіцыйная магчымасць павысіць іх заробак: за вячэрнюю работу па месцы працы або ў іншых месцах (на пасяджэннях, дакладах і г. д.) яны маглі атрымліваць надбаўку ад 20% (12-ы разрад) да 50% (17-ы разрад). Такім чынам, у аплаце працы адказных работнікаў было зроблена паслабленне ў параўнанні з ранейшымі пастановамі, якія забаранялі дадатковае ўзнагароджанне *"за ўдзел у розных пасяджэннях"*. У выніку рэальны заробак адказных работнікаў перавышаў афіцыйна ўстаноўленыя тарыфы. Так, у маі 1922 г. памер аплаты працы адказных работнікаў 14-га разраду па звычайнай тарыфнай сетцы, усталяванай маскоўскімі дырэктывамі, склаў 20 млн рублёў, а з надбаўкамі — ужо 30 млн рублёў, 17-га разраду — адпаведна 25 і 43 млн рублёў[22].

Разам з тым строгая тарыфікацыя заработнай платы ўсіх катэгорый работнікаў (не толькі дзяржслужачых) існавала толькі на паперы. Паводле ацэнкі кіраўніцтва Беларускага вышэйшага тарыфнага савета (жнівень 1922 г.), *"выплата зарплаты ў розных установах насіла хаатычны няўзгоднены характар"*. Так, па наркамаце рабоча-сялянскай інспекцыі сярэдні памер зарплаты складаў у ліпені 1922 г. 14 млн рублёў, па статбюро — 40 млн. рублёў, па НКУС — 25 млн рублёў і паёк, па наркамаце юстыцыі (НКЮ) — 19 млн рублёў і паёк, наркамаце харчавання — 45 млн рублёў і г. д. Для пераадолення падобных разыходжанняў СНК ССРБ рашэннем ад 18 жніўня 1922 г. забараніў усім наркаматам выплачваць зарплаты вышэй устаноўленых тарыфаў[23]. Тым не менш сітуацыя не змянілася: камісія наркамата працы (НКП) ССРБ у лютым 1923 г. правяла праверку, у выніку якой выявіла значныя адрозненні ў аплаце працы па розных наркаматах: у студзені 1923 г. па НКЮ адказныя работнікі па 15-м разрадзе атрымлівалі ўсяго па 185 рублёў у месяц і ў Мінску, і ў паветах, у той час як па НКУС — па 430 руб., па НКП — па 517 рублёў, наркамаце асветы — 602 рублі (у Мінску) і 520 рублёў (у паветах)[24].

Гэтая з'ява была характэрная для ўсяго Савецкага Саюза. На пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП (б) 2 лістапада 1925 г. пры разглядзе пытання "Аб тарыфах і новай сістэме аплаты служачых" наркам працы РСФСР У.У.Шміт сказаў: *"кожная гаспадарчая ўстанова і орган, маючы магчымасць свабодна манеўраваць сродкамі, усталёўваюць самі розную тарыф-*

*ную сетку. Адна ўстанова мела магчымасць даваць больш, іншая давала менш, і на гэтай глебе ўзнікала шмат канфліктаў"*[25].

З 1920 г. аплата працы савецкіх служачых уключала як грашовую, так і натуральную часткі. Найбольшую каштоўнасць ва ўмовах эканамічнай разрухі, дэградацыі фінансавай сістэмы, хуткай дэвальвацыі савецкай грашовай адзінкі ўяўляла яе натуральная частка, якая выдавалася прадуктамі харчавання і таварамі шырокага спажывання. Афіцыйна адзіная для ўсіх катэгорый работнікаў сістэма размеркавання прадуктаў харчавання была ўведзена дэкрэтам СНК РСФСР ад 30 красавіка 1920 года "Аб увядзенні працоўнага харчовага пайка". Згодна з гэтым дэкрэтам, харчовы паёк стаў распаўсюджвацца і на асоб, занятых *"разумовай і канторскай працай у савецкіх установах і прадпрыемствах"*, пры гэтым памеры пайка саўслужачым усталёўваліся на 25% ніжэй, чым для рабочых фізічнай працы, занятых у савецкіх прадпрыемствах і ўстановах[26].

Нормы натуральнага пайка пераглядаліся ў залежнасці ад наяўнасці прадуктаў. Першапачаткова рашэннямі наркаматаў фінансаў і харчавання ССРБ у натуральны паёк саўслужачых меркавалася ўключыць муку, соль, цукар, мяса, тлушчы, гародніну, каву, мыла, запалкі, крупы. Пры гэтым канкрэтны памер іх дыферэнцыраваўся: агульнаграмадзянскі (для большасці служачых), браніраваны (для асобных катэгорый) і адказны (для кіруючага складу — работнікаў з 12-га па 17-га разрады тарыфнай сеткі). У сярэднім "вага" адказнага пайка была больш, чым агульнаграмадзянскага, у два разы па мясе, гародніне і солі, у пяць разоў па цукры, у шэсць разоў — па тлушчах, а таксама дадаткова ён уключаў у сябе 1000 штук папярос і 10 фунтаў крупы (пры адсутнасці кавы). Сямейным саўслужачым "адказнага пайку" планавалася павялічыць прыкладна ў 1,5 разы[27]. Аднак падобны падыход не атрымаў падтрымкі сярод вышэйшага беларускага партыйна-савецкага кіраўніцтва і дыферэнцыяцыя праводзілася толькі па муцэ. Па астатніх пазіцыях, колькасць якіх значна скарацілася, усталёўваліся аднолькавыя нормы. Паёк саўслужачых (незалежна ад разраду тарыфнай сеткі) за студзень 1922 г. уключаў 7 ф. мяса, 1,25 ф. сметанковага масла, 4 ф. солі, чвэрць ф. тытуню. Мука размяркоўвалася па 4 групах: 1-я група (1—4-ы разрады тарыфнай стаўкі) — 40 ф., 2-я група (5—9-ы разрады) — 52 ф., 3-я група (10—13-ы разрады) — 68 ф., 4-я група (14—17-ы разрады) — 80 ф. У якасці сярэдняга па ўсіх катэгорыях саўслужачых пры разліку патрэбаў мукі бралася 60 ф.

Склад і кошт пайка і далей мяняліся ў залежнасці ад змены рынкавых коштаў і наяўнасці прадуктаў. Так, у лютым 1922 г. паёк быў дапоўнены 20 ф. газы, у сакавіку 1922 г. замест газы выдалі 1/8 ф. кавы. У чэрвені 1922 г. натуральны паёк саўслужачых складаўся з мукі (ад 49 да 68 ф.), 4 ф. солі, 15 ф. крупы, 1,25 ф. сметанковага масла[28].

Сітуацыя з натуральным пайковым наборам наглядна сведчыць аб значным падзенні жыццёвага ўзроўню насельніцтва ў пачатку 1920-х гг. Для параўнання можна прывесці набор пражытачнага мінімуму ў Мінску ў студзені 1919 г., адразу пасля нямецкай акупацыі. У гэты набор, больш разнастайны і каларыйны, на аднаго чалавека ўключаліся: хлеб (14 ф.), бульба (40 ф.), мяса (8 ф.), капуста (12 ф.), крупы (4 ф.), сала (6 ф.), чай (0,5 ф.), цукар (1 ф.), мыла, газа або свечкі (4 ф.), цыбуля, соль, перац[29].

У ходзе правядзення фінансавай рэформы з заробкаў да сярэдзіны 1923 г. практычна знікла іх натуральная частка. Пастановай НКП СССР ад 6 лютага 1924 г. тарыф адказных палітработнікаў пераводзіўся на падлік з таварных рублёў у чырвоныя. Гэтая пастанова зноў пацвердзіла дазвол усталёўваць адказным работнікам дадатковую надбаўку ў памеры да 50 % для тых з іх, хто *"у пазаслужбовы час па характары сваёй пасады выконвае работы, якія не падлаюцца ўліку"*[30].

Ва ўмовах барацьбы за эканомію дзяржаўных сродкаў пастановай НКП СССР ад 31 сакавіка 1924 г. з 1 красавіка 1924 г. на 20% зніжаліся тарыфныя стаўкі ўсіх катэгорый адказных палітработнікаў. Гэта прывяло да росту парушэнняў тарыфных нарматываў на месцах, перш за ўсё адказных работнікаў — членаў партыі, для якіх сталі зацвярджаць персанальныя, больш высокія, чым па тарыфах, аклады з розных спецфондаў[31].

Пастановамі НКП СССР ад 31 сакавіка, 27 красавіка і 17 лістапада 1925 г. зноў была скарэктаваная сістэма аплаты адказных палітработнікаў па 17-разраднай тарыфнай сетцы служачых. Усе адказныя палітработнікі дзяліліся на пяць паясоў, для кожнага з якіх усталёўваўся свой памер разліковай стаўкі першага разраду. Замацоўвалася магчымасць павышэння тарыфнай стаўкі на 50%. У сувязі з даволі шырокім тлумачэннем на месцах катэгоры "адказныя палітычныя работнікі" пастанова яшчэ раз адзначала, што пад імі варта разумець толькі тых кіраўнікоў, якія *"нясуць адказнасць не толькі за тэхнічнае выкананне ўскладзеных на іх абавязкаў, але таксама з'яўляюцца адказнымі за палітычнае і ідэйнае правядзенне ўскладзеных на іх абавязкаў"*. Па групе дзяржаўных адміністрацыйна-кіраўнічых органаў улады і кіравання саюзных рэспублік да адказных работнікаў пастанова адносіла членаў ЦВК, СНК, калегій наркаматаў, начальнікаў іх асноўных функцыянальных упраўленняў і загадчыкаў асноўнымі аддзеламі, членаў абласных і губернскіх выканкамаў (17-ы разрад), загадчыкаў асноўнымі аддзеламі абласных і губернскіх выканкамаў (16-ы разрад), членаў акруговых выканкамаў і выканкамаў павятовых гарадоў з насельніцтвам звыш 40 тыс. чалавек (15-ы раз-

рад), членаў павятовых і раённых выканкамаў (14-ы разрад), членаў валасных выканкамаў (11-ы разрад) і старшыняў сельсаветаў (10-ы разрад). Па прафсаюзнай сетцы да адказных палітработнікаў таксама адносіліся намеснікі губаддзеламі працы, інспектары і інструктары працы[32].

Адпаведна 22 снежня 1925 г. сваю пастанову прыняў і НКП БССР. 1 лістапада 1925 г. усталёўвалася аплата па тарыфнай сетцы УЦСПС пры суадносінах 1:8. Тарыф адказных палітработнікаў зыходзіў са стаўкі першага разраду па трэцім поясе — 15 рублёў 25 капеек (Менск, Віцебск, пазней — Гомель), паніжанай на 10% для астатніх акруговых гарадоў (13 рублёў 72 капейкі) і на 25% — для сельскай мясцовасці (11 руб. 44 кап.). У сувязі з новым адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем БССР на акругі — раёны — сельсаветы былі скарэктаваныя і назвы адпаведных кіруючых пасад. Беларуская пастанова дапоўнілася новым артыкулам, які дазваляў усталёўваць самімі адказнымі кіраўнікамі ўстаноў, прадпрыемстваў і арганізацый стаўкі для працаўнікоў, якія фактычна выконвалі *"адказна-палітычную работу"* (хоць і не ўключаных у гэтую разбіўку). Праўда, для практычнай рэалізацыі такіх рашэнняў патрабавалася іх зацвярджэнне НКП БССР[33].

На практыцы пры вызначэнні тарыфаў адказных работнікаў па-ранейшаму існаваў *"разнабой і ненармальнасць"*. Пастановай НКП СССР у 1925 г. БССР па аплаце працы адказных палітработнікаў была аднесена да трэцяга пояса. Беларускае кіраўніцтва гэта не задавальняла, і яно зрабіла шэраг крокаў па пераводзе рэспублікі ў другую, больш высокую па аплаце, катэгорыю. Прапанова сустрэла супраціў з боку НКП СССР. Тым не менш у кастрычніку 1926 г. удалося дамагчыся пераводу ў другі пояс Менска і Віцебска (а з пачатку 1927 г. — і Гомеля). Пры выданні чарговай пастановы НКП СССР аб тарыфных паясах (кастрычнік 1927 г.) Менск, Віцебск і Гомель ужо апынуліся ў другім поясе (стаўка 17-га разраду — 198 рублёў), астатнія — па-ранейшаму ў трэцім (стаўка 17-га разраду — 183 рублі). Аднак на месцах тарыфы адказных палітработнікаў Менска, Магілёва і Гомеля працягвалі па інэрцыі вылічацца як па другім, так і па трэцім паясах. Так, у пачатку 1929 г. Віцебскі акрвыканкам усталяваў членам свайго прэзідыума месячны заробак у 183 рублі, а старшыня і члены Магілёўскага аблвыканкама па-ранейшаму атрымлівалі па 143 рублі[34].

Афіцыйным дадатковым сродкам павышэння матэрыяльнага забеспячэння адказных работнікаў можна лічыць выдачу ім да адпачынку "лячэбных" грошай. Сакратарыят ЦК КП(б)Б 2 чэрвеня 1925 г. даручыў камуністычнай фракцыі СНК БССР (фактычна — самаму СНК БССР) вылучыць на 1925/ 26 гаспадарчы год з рэзервовага фонду дзяржбюджэту 40 тыс. рублёў на дапамогі для лячэння адказных работнікаў, а таксама *"абмеркаваць пытанне аб арганізацыі спецыяльнага фонду для лячэння ў будучыні"*. Таксама было дазволена установам, якія знаходзіліся на гаспадарчым разліку, выдаваць сваім адказным работнікам дапамогу на лячэнне са сродкаў саміх устаноў у памеры не вышэй за 400 рублёў[35].

У канцы 1920-х гг. ва ўнутрыпартыйнай барацьбе перамогу атрымаў І.Сталін. Але яго становішча заставалася нетрывалым. Патрабавалася ўмацаваць свой уплыў сярод мясцовай наменклатуры, у тым ліку і з дапамогай матэрыяльнай зацікаўленасці. З 1929 г. зноў была ўведзена (а па сутнасці, афіцыйна замацавана) асобная (па-за агульнай тарыфнай сеткай) сістэма тарыфаў адказных палітычных работнікаў. Новае палажэнне аб аплаце гэтай катэгорыі НКП СССР зацвердзіў 25 лістапада 1929 г., а 16 лютага 1930 г. унёс у яго некаторыя змены[36]. Аплата працы адказных палітработнікаў стала ажыццяўляцца па шасціразраднай шкале з разбіўкай па пяці паясах. Акрамя таго, яна залежала і ад аднясення адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак да розных груп: першай, больш высокай па памерах стаўкі (раёны прамысловага значэння) і другой (сельскагаспадарчага значэння). Рашэнне аб падзеле на групы прымалася непасрэдна наркаматамі працы саюзных рэспублік.

У канцы 1920-х гг. у БССР да адказных палітработнікаў (па цэнтральных і мясцовых савецкіх органаў дзяржаўнай улады і кіравання) адносіліся старшыня ЦВК, яго намеснікі і сакратар, старшыня СНК і яго намеснікі, наркамы і члены калегій наркаматаў, старшыні пастаянных камісій і камітэтаў пры ЦВК і СНК, начальнікі функцыянальных упраўленняў наркаматаў, загадчыкі самастойнымі функцыянальнымі аддзеламі або сектарамі ЦВК і наркаматаў, старшыні, загадчыкі аддзеламі акруговых і раённых выканкамаў, старшыні гарадскіх саветаў.

Пералік пасад у саюзнай пастанове, што адносіліся да катэгорыі адказных палітычных работнікаў, на месцах зменам не падлягаў і насіў *"вычарпальны характар"*. Аднак у розных справаздачах *"аб фактычным ужыванні тарыфу адказных палітычных працаўнікоў БССР"* фігуруюць пасады, у палажэнні не прапісаныя: члены акруговых і раённых выканкамаў, інспектары рознага кшталту і г. д.

Першапачаткова ў БССР да першай групы адносіліся Бабруйская, Гомельская, Мінская, Магілёўская акругі, астатнія чатыры — да другой. Але ў пачатку 1930 г. сваім рашэннем беларускія ўлады ўсе акругі ўключылі ў першую (больш высокую па аплаце) групу з фармулёўкай *"па вусным узгадненні з намеснікам наркама ўнутраных спраў СССР тав. Талмачовым"*. Адначасова з пачаткам масавай фарсіраванай калектывізацыі НКП БССР да першай групы аднёс раёны суцэльнай калектывізацыі (16), памежныя раёны (19), прамысловыя раёны (9) і раёны па-

казальнай Віцебскай акругі (10), да другой — астатнія 46 сельскіх раёнаў[37].

Лістападаўскім палажэннем 1929 г. значна змяняўся сам падыход да вызначэння заработнай платы адказных работнікаў: калі раней зверху зацвярджаліся максімальныя памеры штомесячнай зарплаты, то цяпер — толькі мінімальная штомесячная зарплата. Гэта стварала магчымасці для значнага павышэння ставак адказным работнікам. Акрамя таго, у чарговы раз дазвалялася акрамя асноўных ставак усталёўваць дадатковую аплату *"у адпаведнасці з перагружанасцю работніка, яго кваліфікацыі і важнасці або адказнасці выконваемай ім працы"*, хоць і вызначаліся гранічныя сумы даплат, якія значна адрозніваліся па паясах і разрадах (ад 45 рублёў па першым разрадзе пятага пояса да 150 рублёў па шостым разрадзе шостага пояса). Інакш кажучы, афіцыйна работнікі шостага і пятага разрадаў маглі атрымліваць на рукі зарплату, якая у два разы перавышала іх тарыфную стаўку, чацвёртага — у 1,85, трэцяга — у 1,83, другога — у 1,56, першага — у 1,54 разы.

Усё гэта дазваляла на месцах за адну і тую ж пасаду налічваць розную зарплату. Так, у 1930 г. у Магілёўскай акрузе тарыфная камісія ўстанавіла старшыні аблвыканкама зарплату ў 215 рублёў (замест 110 рублёў — мінімальнай па палажэнні НКП СССР), старшыні гарсавета, намеснікам старшыні аблвыканкама, загадчыкам акруговымі аддзеламі — 185 рублёў (замест 100 рублёў), сакратарам гарсавета — 160 рублёў (замест 90 рублёў), старшыням райвыканкамаў — 120 рублёў (замест 85 рублёў). У той жа час у Гомельскай акрузе старшыням аблвыканкама і Гомельскага гарсавета вызначылі па 225 рублёў, іх намеснікам — па 200 рублёў (тарыф — 100 рублёў), старшыням райвыканкамаў — па 120—150 рублёў[38]. Падобная практыка ўносіла хаатычнасць і разнабой у зарплатную палітыку, парушала планавасць фінансавай работы, стварала глебу для парушэнняў фінансавай дысцыпліны і для канфліктаў на асабістай глебе паміж кіраўнікамі рознага ўзроўню і розных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

На практыцы заробкі савецкіх служачых нярэдка перавышалі нават тыя, што ім належалі з улікам усіх афіцыйных надбавак. У выніку праверкі органамі Рабоча-сялянскай інспекцыі СССР у 1929—1930 гг. былі ўстаноўлены масавыя парушэнні зацверджаных дзяржаўным нарміраваннем і тарыфнымі пагадненнямі ставак зарплаты служачых дзяржаўнымі і гаспадарчымі органамі: іх рэальная зарплата павялічвалася шляхам прысвaення больш высокай пасады, выплаты звышурочных асобам з ненармаваным рабочым днём, аплаты выхадных дзён і г. д. А для пакрыцця новых выдаткаў на аплату працы выкарыстоўваліся сродкі з *"незаконных крыніц"*[39].

Пры гэтым прыкметным было матэрыяльнае расслаенне і сярод саміх адказных работнікаў. Найбольшую (у колькасных адносінах) частку іх складалі старшыні сельсаветаў, зарплата якіх да пачатку 1930-х гг. значна саступала зарплаце не толькі рабочых, але і практычна ўсіх катэгорый служачых. У чэрвені 1922 г. на пасяджэнні СНК ССРБ адзначалася, што ў многіх месцах зарплата *"настолькі нікчэмна, што старшыні саветаў адмаўляюцца яе атрымліваць, цалкам слушна заяўляючы, што марнаваць дзень на паездку ў воласць для атрымання некалькіх соцень тысяч рублёў не мае сэнсу"*[40]. І ў далейшым матэрыяльнае становішча старшыняў сельсаветаў было вельмі цяжкім. У студзені 1929 г. пры сярэдняй па БССР зарплаце рабочых у 70 рублёў 95 капеек, усіх служачых невытворчай сферы — у 44,3 рублі (у тым ліку машыністак райвыканкамаў — 31,2 руб., справаводаў — 32,7 рублі) старшыні сельсаветаў штомесяц атрымлівалі толькі па 28 рублёў *(гл. табліцу)*[41].

На гэтым фоне становішча старшыняў райвыканкамаў было значна лепш — нават без усялякіх надбавак іх мінімальная тарыфная стаўка складала

*Табліца*

**Сярэднямесячная зарплата рабочых цэнзавай прамысловасці БССР (руб.)[42]**

| Галіна вытворчасці | Гаспадарчы год | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1925/26 | 1926/27 | 1927/28 | 1928/29 |
| керамічная | 49.56 | 55.96 | 60.99 | 67.58 |
| шкляная | 47.60 | 56.49 | 60.44 | 62.70 |
| металаапрацоўчая | 66.85 | 75.53 | 84.32 | 98.07 |
| дрэваапрацоўчая | 50.36 | 56.61 | 60.06 | 64.28 |
| хімічная | 38.30 | 42.29 | 47.63 | 50.96 |
| гарбарная | 69.46 | 77.19 | 88.79 | 98.80 |
| ільноапрацоўчая | 31.99 | 34.67 | 39.69 | 43.41 |
| швейная | 57.14 | 84.25 | 96.87 | 99.32 |
| абутковая | 64.87 | 72.53 | 81.93 | 88.24 |
| папяровая | 48.76 | 55.78 | 61.91 | 68.26 |
| паліграфічная | 59.26 | 65.11 | 76.90 | 83.90 |
| у цэлым па прамысловасці | 50.39 | 57.03 | 63.88 | 70.95 |

85 рублёў, хоць і іх афіцыйная зарплата ў параўнанні са спецыялістамі, якія працавалі ў раёнах, не выклікала зайздрасці: раённы аграном атрымліваў 124 рублі, сельскі лекар — 110 рублёў. Акруговае кіраўніцтва ўжо адчувала сябе яшчэ больш упэўнена: мінімальная тарыфная стаўка (без надбавак) старшыні аблвыканкама складала 110 рублёў, загадчыка аддзела — 100 рублёў[43].

Адрозненне ў заробках выклікала незадаволенасць сярод радавых камуністаў. ЦК КП(б)Б восенню 1925 г. паведамляла: *"афіцыйны максімум ставак — 150 руб., мінімум — 15,5 руб., гэтая розніца сустракаецца не толькі ў розных месцах, але і ў межах адной мясцовасці. На глебе гэтага не спыняецца незадаволенасць адрозненнем ставак і, у прыватнасці, настрой супраць адказных работнікаў"*[44]. Незадаволенымі былі і нізкааплатныя катэгорыі камуністаў, і беспрацоўныя камуністы. Каб змякчыць сітуацыю, у 1927 г. рашэннем ЦК КП(б)Б спаганяліся нават асобыя мэтавыя адлічэнні ў 1% ад заробку *"некаторых груп працуючых партыйцаў"* у фонд дапамогі беспрацоўным камуністам. Перш за ўсё працэнт спаганяўся з высокааплатных груп камуністаў, інакш кажучы, тых, хто атрымліваў больш за 101 рубель у месяц[45].

У 1920-я гг. абмежавальнікам заробкаў адказных палітработнікаў служыў партмаксімум. Увядзенне партмаксімуму некаторыя даследчыкі звязваюць з названай вышэй пастановай УЦВК ад 23 чэрвеня 1921 г. аб увядзенні ў дзеянне новага палажэння аб тарыфе адказных работнікаў прафсаюзных, эканамічных, савецкіх і партыйных арганізацый. Іншыя вядуць яго гісторыю з XII канферэнцыі РКП (б) (жнівень 1922 г.), якая ўстанавіла, што камуністы павінны пералічваць у *"фонд узаемадапамогі сярод камуністаў"* ад 25 да 50 % розніцы паміж сваім акладам і паўтарачнай стаўкай 17-га разраду. Акрамя таго камуністы, якія атрымлівалі звыш лімітавай тарыфнай стаўкі, увесь лішак таксама перадавалі ў гэты фонд[46]. Калі быў адменены партмаксімум? Гэтае пытанне застаецца адкрытым. Сёння прынята лічыць, што афіцыйна партмаксімум адмянілі рашэннем Палітбюро ЦК УсеКП(б) 8 лютага 1932 г.[47].

Звычайна тарыфныя стаўкі адказных палітработнікаў не перавышалі памеры партмаксімуму, якія мяняліся і дыферэнцыраваліся па адміністрацыйна-тэрытарыяльных узроўнях: у БССР у 1927 г. яны складалі па Менску, Віцебску і Гомелі 183 рублі, па іншых акруговых гарадах — 164 рублі, па сельскіх раёнах — 137 рублёў у месяц[48]. Партмаксімум тычыўся галоўным чынам featured ўзроўню кіраўнікоў. У той жа час камуністы, якія працавалі непасрэдна на вытворчасці (рабочыя, майстры, спецыялісты, занятыя ў тэхнічных і канструктарскіх бюро) атрымлівалі зарплату цалкам — на іх партмаксімум не распаўсюджваўся.

З сярэдзіны 1920-х гг. пачала распрацоўвацца новая тарыфная рэформа, якая павінна была павысіць значэнне тарыфнай стаўкі ў зарплаце і знізіць ролю розных каэфіцыентаў, даплат і прэмій. На пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) 2 лістапада 1925 г. было разгледжана пытанне "Аб тарыфах і новай сістэме аплаты служачых". З асноўным дакладам выступіў старшыня СНК СССР і РСФСР А.І.Рыкаў, які вылучыў галоўную мэту рэформы — стварэнне *"аднастайнай, па магчымасці, аплаце працы адных і тых жа катэгорый у адных і тых жа раёнах"*. Прапаноўвалася ўсталяваць дакладную наменклатуру пасад служачых, у адпаведнасці з якой вызначыць і цвёрдыя аклады для ўсіх устаноў. Па словах М.П.Томскага (кіраўнік УЦСПС), на справе гэта азначала пераход да цвёрдай штатнай сістэмы, якая існавала ў дарэвалюцыйных дзяржустановах, *"калі кожнае ведамства мела штатны расклад і цвёрдыя прысвоеныя, зацверджаныя ім аклады"*[49]. Прыхільнікі гэтай сістэмы лічылі, што такім чынам надалей можна адмовіцца *"ад розных камісій па перыядычным скарачэнні і наогул ад усялякіх пытанняў аб штатах і пераменах, якія існуюць у ведамствах"*. З крытыкай такіх уніфікацыйных навацый выступілі Л.Б.Красін (намеснік наркама знешняга і ўнутранага гандлю СССР) і Г.Л.Пятакоў (намеснік старшыні Вышэйшага савета народнай гаспадаркі СССР). Па словах Л.Красіна, *"прапанаваная рэформа... супярэчыць асноўным здаровым прынцыпам адміністравання... яна не дае магчымасці кіраўніку ведамства або самастойнага аддзела дастаткова вар'іраваць аклады ў залежнасці ад індывідуальных якасцяў асобы"*. Тым не менш Палітбюро ЦК РКП(б) зацвердзіла прапанаваны варыянт рэформы, які тычыўся першапачаткова толькі работнікаў цэнтральных наркаматаў[50].

Рэалізацыя на практыцы гэтай новай (штатнай) сістэмы пачалася з кастрычніка 1926 г. Прамое дзяржаўнае нармаванне заработнай платы з вызначэннем цвёрдых акладаў па бюджэце па-за разраднай сеткай атрымлівала ўсё больш шырокае прымяненне, у тым ліку і ў органах дзяржаўнага кіравання. Такая сістэма адпавядала інтарэсам палітыкі фарсіраванага будаўніцтва сацыялізму і выразна ўпісвалася ў строга цэнтралізаваную мадэль кіравання грамадствам. У выніку ў пачатку 1930-х гг. фактычна тарыф адказных палітработнікаў быў ліквідаваны. Рэгуляванне зарплаты кіраўнікоў савецкіх дзяржаўных органаў улады і кіравання стала ажыццяўляцца па-за тарыфнай сеткай адмысловымі рашэннямі саюзнага і рэспубліканскага ўрадаў. Адпаведна расла роля вышэйшага партыйнага і савецкага кіраўніцтва, якое магло павышаць зарплату асобных катэгорый насельніцтва кропкава (у тым ліку і кіруючых кадраў) без неабходнасці яе паўсюднага росту для ўсіх у рамках тарыфнай сістэмы. Ужо ў канцы 1930 г. СНК БССР зацвердзіў новыя цвёрдыя стаўкі заробкаў па мясцовым бюджэце, якія тычыліся савецкіх служачых, у тым ліку старшыняў райвыканкамаў і сельсаветаў, загадчыкаў

аддзеламі, раённых інструктараў і інспектараў. Устаноўленыя такім чынам цвёрдыя стаўкі не саступалі, а часцей за ўсё перавышалі ранейшыя заробкі мясцовых кіраўнікоў нават з улікам надбавак. Так, старшыні гарсаветаў сталі атрымліваць у месяц ад 100 да 200 рублёў (Віцебск і Гомель) і 225 рублёў (Менск), іх сакратары — адпаведна ад 50 да 175 рублёў, старшыні райвыканкамаў — ад 175 да 200 рублёў[51].

Варта адзначыць, што тарыф "адказны" фактычна быў тарыфам "наменклатурным", ствараючы матэрыяльную аснову функцыянавання наменклатурнага прынцыпу кадравай палітыкі. Па такім тарыфе рэгулявалася зарплата наменклатурных работнікаў, а сам іх пералік практычна паўтараў пералік асоб, на якіх гэты тарыф распаўсюджваўся. Ды і сам працэс фарміравання наменклатурнай сістэмы шмат у чым пачынаўся менавіта з асаблівага тарыфнага рэгулявання: першыя спісы асоб, аднесеных па аплаце да тарыфу адказных палітычных работнікаў, фактычна ўжо вызначалі кола пасад будучай партыйнай наменклатуры.

На працягу першых дзесяці гадоў савецкай улады стаўленне да аплаты працы адказных работнікаў зведала істотную трансфармацыю. Па-першае, пашыраўся і карэктаваўся спіс савецкіх служачых, аднесеных да тарыфу адказных палітработнікаў. Па-другое, змянялася стаўленне да прынцыпаў вызначэння іх заробкаў. Надзеі на хуткае фарміраванне новага пласта савецкіх кіраўнікоў-аскетаў, якія кіруюцца ў сваёй дзейнасці перш за ўсё ідэяй пабудовы новага сацыялістычнага грамадства, даволі хутка развеяліся: такіх ідэйных кіраўнікоў аказалася занадта мала, а з часам і яны сталі патрабаваць "годнага" матэрыяльнага ўзнагароджання. Ужо з самага пачатку прымяненне ўраўняльных прынцыпаў было абмежавана. Мабілізацыйны ідэйны патэнцыял ваеннага часу *("перамога ці смерць")* перастаў граць сваю вырашальную ролю, затое рэзка вырасла значэнне матэрыяльнага фактару ў стымуляванні кіраўнічай работы. Матэрыяльны дастатак перастае быць сведчаннем *"дробнабуржуазнага перараджэння"*. Гэтаму спрыяла рэанімацыя з пачатку 1920-х гг. таварна-грашовых адносін і грашовай аплаты працы. Месца ідэі як галоўнага рэальнага матыватара працы для ўсё большай колькасці кіраўнікоў (хоць значны час далёка не ўсіх) заняў матэрыяльны дастатак. Спробы лідэраў "дэцістаў" і "рабочай апазіцыі" ў пачатку 1920-х гг. супрацьстаяць гэтым з'явам скончыліся поўным правалам — крытыка адрыву ад мас партыйных вярхоў, іх матэрыяльнага забеспячэння *("кватэры, харчаванне, аўтамабілі")* не атрымала падтрымкі нават у сваім прафсаюзна-камуністычным акружэнні. Ужо да сярэдзіны 1920-х гг. пытанне і не толькі аб неабходнасці матэрыяльнага стымулявання працы кіраўнікоў, але і наогул аб суадносінах аплаты працы рабочых і кіраўнікоў зніклі з парадку дня ўнутрыпартыйных дыскусій. На згаданым вышэй пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) 2 лістапада 1925 г. ні ў каго з прысутных не выклікала нават хоць бы слабай крытыкі такое агучанае наступства тарыфнай рэформы, як павелічэнне розніцы паміж вышэйшай і ніжэйшай стаўкамі на 30—40%[52]. 1920-я гг. характарызуюцца паслядоўнай рэалізацыяй лініі на апераджальны рост матэрыяльнага забеспячэння адказных кіраўнікоў шляхам увядзення рознага роду дадатковых выплат, пераходам да штатнай сістэмы.

Пры гэтым афіцыйныя памеры іх матэрыяльнага дастатку, што фіксаваліся статыстыкай, часцяком не адпавядалі рэальнаму стану спраў (за рамкамі аналізу застаюцца рознага роду афіцыйныя і неафіцыйныя прывілеі). Улічваючы рознага роду надбаўкі, прэміі і масавыя фінансавыя парушэнні пры вызначэнні ім заработнай платы (неабгрунтаваныя павышэнні яе памераў), рэальныя заробкі значнай часткі адказных работнікаў былі значна вышэй за іх афіцыйныя тарыфныя стаўкі. Да таго ж сама методыка разлікаў з прымяненнем дыферэнцыяцыі па тарыфных паясах, выкарыстанні асобных павышаючых каэфіцыентаў і сёння ўскладняе навуковы аналіз праблемы, даючы шырокі прастор рознага кшталту інтэрпрэтацыям.

---

[1] Гимпельсон Е.Г. Советские управленцы, 20-е годы: Руководящие кадры государственного аппарата СССР. Москва, 2001; Коржихина Т.П., Фигатнер Ю.Ю. Советская номенклатура: становление, механизмы действия // Вопросы истории. 1993. № 7. С. 25—38; Ильюхов А.А. Как платили большевики: политика советской власти в сфере оплаты труда в 1917—1941 гг. Москва, 2010.

[2] Протько Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917—1941 гг.). Минск, 2002.

[3] Ленин В.И. Государство и революция // Полное собрание сочинений : в 55 т. 5-е изд. Т. 33. Москва, 1969. С. 190.

[4] Алексашина Г.В. Наёмные работники в городах Беларуси: состав, правовое и экономическое положение (1890—1913 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02. Минск, 2019.

[5] Декреты Советской власти. Т. 2. (17 марта — 10 июля 1918 г.). Москва, 1959. С. 181—182.

[6] Там жа. С. 488—494.

[7] Декреты Советской власти. Т. 3 (11 июля — 9 ноября 1918 г.). Москва, 1964. С. 414—418.

[8] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей — НАРБ). Ф. 809, воп. 1, спр. 1, арк. 119—120.

[9] НАРБ. Ф. 810, воп. 1, спр. 2, арк. 37.

[10] Там жа. Спр. 6, арк. 32.

[11] Там жа. Спр. 49, арк. 48—52.

[12] Декреты Советской власти. Т. 5 (1 апреля — 31 июля 1919 г.). Москва, 1971. С. 79—80.

[13] Декреты Советской власти. Т. 6 (1 августа — 9 декабря 1919 г.). Москва, 1973. С. 168—170.

[14] Декреты Советской власти. Т. 9 (июнь — июль 1920 г.). Москва, 1978. С. 17—19.

[15] НАРБ. Ф. 265, воп. 1, спр. 381, арк. 48.

[16] КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (*1898—1953*). В 2 ч. Ч. 1. Изд-е 7. Москва, 1953. С. 511.

[17] Собрание узаконений РСФСР. 1921 г. № 53. Ст. 326.

[18] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1. спр. 441, арк. 96.

[19] НАРБ. Ф. 265, воп. 1, спр. 381, арк. 77 — 77 адв.

[20] НАРБ. Ф. 6, воп. 1, спр. 32, арк. 290.

[21] НАРБ. Ф. 265, воп. 1, спр. 346, арк. 72.

[22] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 441, арк. 92 — 92 адв.

[23] НАРБ. Ф. 6, воп. 1, спр. 90, арк. 58.

[24] Там жа. Спр. 266, арк. 3.

[25] Стенограммы заседаний Политбюро ЦК РКП(б) — ВКП(б). 1923—1938 гг.: в 3 т. Т. 1. 1923—1926 гг. Москва, 2007. С. 413—414.

[26] Декреты Советской власти. Т. 8 (апрель — май 1920 г.). Москва, 1976. С. 132—136.

[27] НАРБ. Ф. 93, воп. 1, спр. 227, арк. 33—34.

[28] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 441, арк. 42, 44, 70.

[29] НАРБ. Ф. 809, воп. 1, спр. 1, арк. 37.

[30] Данилова Е.Н. Действующее законодательство о труде Союза ССР и Союзных республик: в 4-х т. Т. 1. Москва, 1925. С. 315.

[31] Там жа. С. 316, 317.

[32] Данилова Е.Н. Действующее законодательство о труде Союза ССР и Союзных республик. 2-е изд., перераб. и доп.: в 2 т. Т. 1. Москва, 1927. С. 357—360.

[33] Там жа. С. 361.

[34] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1. спр. 4323, арк. 84.

[35] Там жа. *Спр. 1335*, арк. *196*.

[36] НАРБ. Ф. 44, воп. 1, спр. 1828, арк. 57 — 60 адв.

[37] НАРБ. Ф. 34, воп. 1, спр. 141, арк. 227.

[38] Там жа. Арк. 38—39.

[39] Там жа. Арк. 145.

[40] НАРБ. Ф. 188, воп. 1, спр. 1918, арк. 13.

[41] Труд в СССР. Эконом.-стат. справочник. Москва — Ленинград, 1932. С. 148.

[42] Белорусская ССР в цифрах. К 10-летию существования БССР. 1919—1929. Минск, 1929. С. 332—333.

[43] НАРБ. Ф. 4п., воп. 1, спр. 4760, арк. 36.

[44] Там жа. Спр. 2204, арк. 100.

[45] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці (далей — ДАГАГВ). Ф. 3, воп. 1, спр. 272, арк. 35.

[46] КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. С. 679.

[47] О партмаксимуме // Известия ЦК КПСС. 1990. № 7. С. 147.

[48] ДАГАГВ. Ф. 3, воп. 1, спр. 273, арк. 10, 22.

[49] Стенограммы заседаний Политбюро ЦК РКП(б) — ВКП(б). С. 413—414.

[50] Там жа. С. 424.

[51] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 296, воп. 1, спр. 186, арк. 182 — 183 адв.

[52] Стенограммы заседаний Политбюро ЦК РКП(б) — ВКП(б). С. 414—415.